**Міжнародная навуковая канферэнцыя *Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі*, Мінск, Беларускі Дзяржаўны Ўніверсітэт, 27–28 чэрвеня 2014 г.**

З 27 па 28 чэрвеня 2014 года на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску прайшла традыцыйная міжнародная навуковая канферэнцыя *Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі*, якая адбываецца штогод папераменна ў Беларусі і Польшчы. Сёлетняя канферэнцыя – XXIII з гэтага цыклу – стала добрым працягам існуючай традыцыі і сабрала зацікаўленых навукоўцаў з Беларусі (Мінск, Магілёў) і Польшчы (Аполе, Беласток, Варшава, Люблін), а таксама Германіі (Ольдэнбург). Арганізатарамі канферэнцыі выступілі грамадскае аб'яднанне Міжнародная асацыяцыя беларусістаў і філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску.

27 чэрвеня 2014 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё канферэнцыі, на якім з прывітальнымі словамі выступілі старшыня рэспубліканскага аддзялення ГА Міжнародная асацыяцыя беларусістаў дацэнт БДУ І. Э. Багдановіч, дэкан філалагічнага факультэта БДУ доктар філалагічных навук прафесар І. С. Роўда, старшыня ГА Міжнародная асацыяцыя беларусістаў акадэмік доктар гістарычных навук прафесар М. П. Касцюк, якія адзначылі важнасць правядзення такіх канферэнцый для ўмацавання міжкультурнага дыялогу паміж нашымі народамі, паглыблення супрацоўніцтва ў адукацыйнай і навуковай сферы, узаемаразумення і наладжвання непасрэдных творчых кантактаў паміж навукоўцамі розных краін.

Падчас адкрыцця канферэнцыі за шматгадовую плённую дзейнасць у галіне беларусістыкі і ў сувязі з юбілеем быў ушанаваны ганаровай граматай прафесар Міхал Саевіч, дырэктар Інстытута славянскай філалогіі Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне (Польшча), кіраўнік кафедры беларусістыкі, старшыня Польскага таварыства беларусістаў. У сваім выступленні прафесар М. Саевіч падкрэсліў, што навуковае супрацоўніцтва люблінскага УМКС і мінскага БДУ, якое пачалося ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, развіваецца па сённяшні дзень. Дзякуючы падпісанай у 1991 годзе ў Мінску дамове ў польска-беларускім абмене ўдзельнічала больш за 20 выкладчыкаў і амаль 500 студэнтаў. Згодна з навуковай традыцыяй, навукоўцы з Любліна і Мінска штогод сустракаюцца ў розных гарадах Польшчы і Беларусі на міжнародных канферэнцыях, найважнейшая з якіх – *Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі*. Тут ужо больш за 20 гадоў не спыняюцца навуковыя дыскусіі, у якіх удзельнічаюць як старэйшае, так і маладзейшае пакаленні навукоўцаў.

На пленарным пасяджэнні былі выслуханы чатыры даклады: прафесара Міхала Саевіча з Любліна (*Rejestr pomiary włócznej z 1560 roku jako najwcześniejsze źródło wiedzy o imiennictwie XVI-wiecznych mieszkańców miasta Kleszczele i okolic na Podlasiu*), доктара філалагічных навук дацэнта БДУ Жанны Некрашэвіч-Кароткай з Мінска (*«Польскасць» – «беларускасць» у літаратуры XIX ст.: стратэгіі ідэнтыфікацыі ў сучасным літаратуразнаўчым дыскурсе*), ганаровага старшыні ГА Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, доктара філалагічных навук, прафесара Адама Мальдзіса з Мінска (*Кракаўскі музей Эмерыка Гутэн-Чапскага: подзвіг ці здрада?*), намесніка дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, кандыдата культуралогіі Алеся Сушы з Мінска (*Кніжная спадчына Беларусі ў польскіх зборах: перспектывы вывучэння і сумеснага выкарыстання*).

На працягу двух дзён, 27–28 чэрвеня, працавалі тры секцыі: мовазнаўчая, літаратуразнаўчая, а таксама секцыя гісторыі і культуралогіі. У іх працы ўдзельнічалі 36 навукоўцаў з Беларусі, Польшчы, а таксама Германіі. Тэматычнае поле канферэнцыі вылучалася разнастайнасцю і актуальнасцю, нязменнай цікавасцю да феномена памежжа, супольнага сужыцця нашых народаў на працягу многіх стагоддзяў у мінулым, што адлюстравалася ў моўных асаблівасцях, гістарычных і культурных стасунках, па-свойму адбілася ў літаратурных творах. Не змяншаецца ўвага даследчыкаў і да заходнебеларускай тэматыкі, якая таксама складае асаблівы гістарычны і культурны феномен памежжа. Нязменнай увагай карыстаюцца і сучасныя аспекты польска-беларускага / беларуска-польскага літаратурнага і моўнага ўзаемадзеяння.

Удзельнікі мовазнаўчай секцыі, якая працавала пад кіраўніцтвам дацэнта БДУ Ганны Кулеш (Мінск) і прафесара Міхала Саевіча (Люблін), выслухалі 16 дакладаў навукоўцаў з Мінска, Варшавы, Беластока і Любліна. У сваіх выступленнях мовазнаўцы прэзентавалі вынікі навуковых даследаванняў у розных галінах славянскай лінгвістыкі, між іншым, сучаснай і гістарычнай лексікаграфіі (Ірына Савіцкая з Мінска, Вікторыя Уласевіч з Мінска, Ліля Цітка з Беластока, Святлана Богуш з Мінска), стылістыкі і тэрміналогіі (Ганна Кулеш з Мінска, Ганна Спорыш з Мінска), граматыкі і словаўтварэння (Ядвіга Казлоўская-Дода з Любліна), антрапаніміі (Соф'я Абрамовіч з Беластока), а таксама методыкі выкладання моў (Радаслаў Калета з Варшавы).

У літаратуразнаўчай секцыі, якую вялі прафесар Уладзімір Кароткі з Мінска і прафесар Сяргей Кавалёў з Любліна, прачытана 10 дакладаў навукоўцаў з Мінска, Магілёва, Любліна, Беластока і Аполя. У працах секцыі абмяркоўваліся пытанні ўзаемных польска-беларускіх літаратурных кантактаў (Беата Сівек з Любліна, Вячаслаў Караткевіч з Магілёва, Сяргей Кавалёў з Любліна), выбраныя матывы творчасці беларускіх і польскіх пісьменнікаў: У. Гайдука (Галіна Твarановіч з Беластока), Я. Коласа (Алена Манкевіч з Мінска), Я. Чачота (Таццяна Кохан з Мінска), Ф. Багушэвіча (Ігар Запрудскі з Мінска), У. Караткевіча (Томаш Вельг з Аполя), С. Пясецкага (Мікалай Хмяльніцкі з Мінска).

Актыўна працавала таксама – пад кіраўніцтвам прафесара Уладзіміра Навіцкага з Мінска і прафесара Лены Глагоўскай з Беластока – секцыя гісторыі і культуралогіі, удзельнікам якой была прапанавана 10 дакладаў. Праблематыка выступленняў была разнастайнай і тычылася дзейнасці выдатных постацяў беларускай і польскай культуры: В. Адважнага (Ірына Багдановіч з Мінска), А. Стэповіча (Лена Глагоўская з Беластока), Я. Булгака (Маргарыта Петухова з Мінска), старабеларускай рэлігійнай палемікі (Марына Свістунова з Мінска), беларуска-рускага дыялогу культур (Святлана Снапкоўская з Мінска), тэорыі поля ў беларускай літаратуры (Гун-Брыт Колер з Ольдэнбурга і Павел Навуменка з Мінска).

Даклады, якія прагучалі падчас канферэнцыі, выкананы на высокім навуковым узроўні, вызначаліся актуальнасцю, навізной прааналізаванага матэрыялу і падыходаў да вырашэння пастаўленых навуковых праблем. Кожнае выступленне выклікала водгук аўдыторыі, жывое абмеркаванне і дыскусіі. У рабоце секцый бралі ўдзел як вядомыя навукоўцы, так і маладыя даследчыкі. Беларускія і польскія навукоўцы атрымалі магчымасць не толькі плённага навуковага супрацоўніцтва, але і наладжвання асабістых кантактаў.

Праца канферэнцыі праходзіла ў добразычлівай атмасферы, на ёй адбываўся шчыры абмен ведамі, думкамі і вопытам, што было адзначана кіраўнікамі секцый на закрыцці канферэнцыі, якое адбылося 28 чэрвеня.

Зборнік навуковых артыкулаў па выніках правядзення канферэнцыі будзе выдадзены як выпуск серыйнага выдання *Acta Albaruthenica*.

Правядзенне падобных канферэнцый і ў далейшым будзе спрыяць наладжванню навуковага дыялогу і супрацоўніцтва паміж даследчыкамі Беларусі і Польшчы.

*Ірына Багдановіч, Марына Свістунова, Агнешка Гораль*